Жыві, Беларусь!

# Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 182 (195) 18 верасня 1991 г. Серада.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

## Факты Аргументы Комментарии Суждения

### Посадили. Лучше строить!

**На днях был досрочно освобожден бывший директор Чернобыльской АЭС В. Брюханов.**

Большую часть времени он отбыл в колонии общего режима, затем перевели на принудительные работы, так называемую «химию». В общей сложности «отсидел» около пяти лет — половину срока.

Виктор Брюханов заявил, что когда встал вопрос о том, кому отвечать за ту страшную катастрофу, он нисколько не сомневался, что будет «принесен в жертву. Ну, не советскую же науку сажать на скамью подсудимых, не могущественных академиков и всесильный тогда Минсредмаш». Хотя, стоит теперь добавить, реакторы на ЧАЭС не соответствуют международным стандартам и для целей энергетики в мире вообще не используются.

В. Брюханов в интервью газете «Труд» также добавил, что сейчас самое лучшее — остановить Чернобыльскую АЭС полностью, иначе может случиться новая авария.

### Не пейте, дети, молоко

НОВОЛУКОМЛЬ. **Четыре дня подряд принимала городская больница людей с признаками острого отравления.**

Сначала поступило 52 ребенка в возрасте от года до двенадцати, позже —29 взрослых. Новолукомльский молокозавод, продукция которого, по мнению санэпидслужбы, явилась причиной инфекции, закрыт. Смертельных исходов пока нет.

### За холодильником стоит побегать

**В Минске состоялся І-й Международный полумарафон под девизом «За жизнь после Чернобыля», организованный Ассоциацией спорта БССР.**

В пробеге приняли участие более 300 спортсменов и любителей бега из многих городов страны. К сожалению, августовские события отпугнули бегунов из США, Германии, Италии, Швеции, Финляндии.

Абсолютными победителями забега на 21,1 км стали минчане Сергей Соков и Раиса Смехова. Они получили в качестве призов крайне дефицитные товары — автоприцепы «Зубренок» и холодильник.

### Служба идет — смута сеется

БРАСЛАВ. **Объявление о том, что служба в костеле будет проводится на белорусском языке, вызвало смуту среди прихожан.**

«Мы считаем,—заявили они, — что у нас никто не знает белорусского языка... Мы просили, чтобы наш ксендз Франц учил детей молиться по-польски, как привыкли старшие поколения, а молебен служил по-русски, ибо этот язык понимает и стар, и млад».

Забавно, что свой протест прихожане опубликовали в районной газете, которая выходит на белорусском языке и которую на Браславщине умеет читать и стар, и млад.

### Подпольный горком действует

ОРША. **Из источников, заслуживающих доверие, стало известно, что в условиях приостановки деятельности компартии горком КПБ провел конференцию.**

Место, где потихоньку собрались члены комитета, пока не установлено. Можно предположить, что, по примеру РСДРП, использовали либо конспиративную квартиру, либо опушку леса.

Не исключено, что через семьдесят лет на этом тайном месте будет установлен памятный знак.

### Рубикс жалеет, что верил Горбачеву

**«Я никогда не выступал против того, чтобы республика была свободной и суверенной»,— сказал бывший первый секретарь ЦК Компартии Латвии Альфред Рубикс в интервью для латвийского телевидения.**

С 23 августа он содержится в Рижском следственном изоляторе для выяснения его роли в августовском путче. «Единственное, о чем я сожалею,—это о том, что слишком верил Горбачеву. Ведь поначалу у нас с ним были даже теплые отношения», — заявил он.

Альфред Рубикс во время интервью сказал, что пребывание в тюрьме «психологически трудно», но с ним обращаются «достаточно честно», и он надеется, что это лишь маленький инцидент в его жизни. Кроме того, он считает, что «ничего еще не кончено. И все еще впереди».




Рисунок Олега ПОПОВА.

### КГБ с депутатами не «перестукивается»

ЕРЕВАН. **50 депутатов Верховного Совета Армении потребовали огласить имена тех, кто сотрудничал в свое время с КГБ.**

Отвечая на запрос парламентариев, председатель Комитета госбезопасности У. Арутунян заявил, что это может привести к очень серьезным последствиям. К тому же, отметил он, согласно существующему в течение 70 лет порядку личные дела сотрудничавших с КГБ лиц уничтожались, как только эти люди избирались или назначались на высокие должности.

### Вкратце

✦ Государственный Совет СССР одобрил в принципе союзный экономический Договор, который будет признавать суверенитет входящих в него республик.

✦ Премьер-министр Литвы и министр иностранных дел Германии пришли к соглашению о расширении сотрудничества..

✦ Президенты Польши и Чехо-Словакии призвали создать международные силы для прекращения боев в Югославии.

✦ В Тбилиси продолжаются демонстрации как противников, так и сторонников президента Грузии Звиада Гамсахурдиа.

✦ Городской Совет Санкт-Петербурга обратился к Европейскому сообществу с просьбой оказать городу помощь, чтобы предотвратить ожидаемую нехватку продуктов питания этой зимой. Мэр Анатолий Собчак попросил выделить 20 тысяч тонн мыла. Столько же — молочного порошка и 50 тысяч тонн мяса.

### Краска закуплена. Бои продолжаются

СВЕРДЛОВСК. **Несмотря на призывы властей воздержаться от актов вандализма, война с памятниками идет и причем в самой варварской форме.**

На Ивановском кладбище осквернена могила Петра Ермакова, который участвовал в расстреле царской семьи. Он, как он сам уверял, лично убил Николая II.

На памятнике неизвестными выведено огромными буквами: цареубийца. Как отмечается в «Деяниях» Ермакова — личное дело каждого. Но, по мнению многих, тревожить его последний приют столь же неспособно, как и стрелять в беззащитного государя.

### Начальник до колонии подбросит

БАШКИРИЯ. **Из исправительно-трудовой колонии, расположенной на территории республики, сбежал осужденный.**

Наконец, уже в сумерках один из легковых притормозил и подобрал беглеца. Каково же было потрясение пассажира, когда, присмотревшись к своему благодетелю, он узнал в нем... начальника своей колонии.

### Спокойствие, нам это не грозит

РЕЙКЬЯВИК. **За первую половину текущего года импорт продовольственных товаров в Исландию сократился на 1,5 процента.**

Но, похоже, голод этой стране не грозит, поскольку, по существу, острове в Приполярье стоит проблема перепроизводства сельскохозяйственной продукции.

Выпуск подготовлен по сообщениям Виктора ЛЕЩЕНКО, Сергея БУТКЕВИЧА, Вячеслава ИЩЕНКО и агентств «Инфо-нова» и «Урал-акцепт». «Горячий» телефон работает ежедневно с 9 до 11 часов.

---

На сесіі Вярхоўнага Савета БССР

## ШОСТАЯ НЕЧАРГОВАЯ—ЦІ ПЕРШАЯ «НЕЗАЛЕЖНАЯ»?

— Наша сесія пачынае сваю працу ў прынцыпова іншай сітуацыі — ва ўмовах незалежнай Беларусі. Але мы не зробім суверэнітэт рэальным без мовы. Кожны народ, атрымліваючы незалежнасць, пачынаў з суверэнітэту духу, кожны народ падымаў як сцяг родную мову. Вось чаму я заклікаю ўсіх вас перайсці ў сваёй рабоце тут на родную мову!

Так пачаў сваё выступленне народны дэпутат пісьменнік Ніл Гілевіч. Яго словы і мы вынеслі ў пачатак справаздачы з сапраўды першай сесіі парламента незалежнай Беларусі. Але наколькі яна незалежная, калі (акрамя Польшчы) будзе прызнана іншымі краінамі, а галоўнае — калі мы, беларусы, самі адчуем сябе незалежнымі? Адказы на ўсе гэтыя пытанні, безумоўна, залежаць сёння ва многім ад працы Вярхоўнага Савета Беларусі.



І ўжо сам пачатак сесіі абнадзеяў, што парламент зможа прыняць вельмі многія важныя рашэнні. З праектам парадку дня выступіў намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР Васіль Шаладонаў. Праект ужо быў надрукаваны «Народнай газетай», таму няма неабходнасці зараз яго паўтараць. Важна толькі адзначыць, што ў яго была ўключана і частка пытанняў, якія прапанавала апазіцыя БНФ. Тым не менш ад апазіцыі з альтэрнатыўным праектам парадку дня сесіі выступіў Зянон Пазьняк. Ён прапанаваў у першую чаргу разгледзець пытанні «Аб падпарадкаванні мытнай службы», «Аб генеральным пракурору Беларускай ССР». Апазіцыя дэталёва распрацавала пытанне «Аб сістэме абароны і нацыянальнай бяспекі Беларускай ССР», палічыла неабходным уключыць пытанні «Аб прызнанні права прыватнай уласнасці на зямлю ў Беларускай ССР і ўнясенні зменаў у заканадаўства Беларускай ССР», «Аб роспуску структур КПСС — КПБ і пераводзе ў дзяржаўную ўласнасць яе маёмасці на тэрыторыі Беларускай ССР» і іншыя.

Народны дэпутат Уладзімір Кудлаш прапанаваў разгледзець пытанне аб лёсе камсамола рэспублікі, Мікалай Крыжаноўскі — аб справаздачы Саўміна рэспублікі, Анатоль Вярцінскі прызваў парламент рэспублікі выказаць свае адносіны да рэспублік Прыбалтыкі, прызнаць іх незалежнасць, садзейнічаць прыняццю новых дзяржаў у склад ААН. Былі і іншыя прапановы, потым пачалося іх абмеркаванне і галасаванне.

З дзесяці пунктаў, унесеных Прэзідыумам, найбольшыя спрэчкі вызваў першы — выбіраць або не на нечарговай сесіі Старшыню Вярхоўнага Савета БССР. Некаторыя дэпутаты гаварылі, што Станіслаў Шушкевіч добра спраўляецца з абавязкамі намесніка Старшыні ВС БССР, спакойна можа выконваць і абавязкі Старшыні, што зараз ёсць больш важкія праблемы і трэба разглядаць іх у першую чаргу. Аднак 254 дэпутаты палічылі, што парламент абавязаны зараз выбраць кіраўніка рэспублікі. Гэтак жа амаль аднадушна былі прыняты яшчэ сем пунктаў, прапанаваных Прэзідыумам ВС БССР. І толькі пытанне «Аб назве сталіцы Беларускай ССР» парламент разглядаць пакуль што не пажадаў.

Больш гарачыя спрэчкі пачаліся, калі сесія пачала разглядаць пытанні, прапанаваныя ў парадак дня апазіцыяй. Тым не менш большасць дэпутатаў палічыла неабходным разабрацца з мытнай службай рэспублікі, абраць Генеральнага пракурора Беларусі. Яшчэ перад разглядам гэтага пытання слова папрасіў Пракурор БССР Георгій Тарнаўскі і сказаў:

— Я ацэньваю такую прапанову як вынік палітычных страсцей у парламенце. Сёння многія абвінавачваюць пракуратуру, мяне асабіста ў падтрымцы ДКНС. Я не збіраюся апраўдвацца, упэўнены, што часовая камісія ВС БССР дасць аб'ектыўную ацэнку. Але я павінен заявіць наступнае: нідзе — ні пісьмова, ні вусна — я не падтрымліваў ДКНС. Я выконваў законы рэспублікі. Я адхіліў прапанову... аб закрыцці газеты «Знамя юности», на званкі... аб несанкцыяніраваных мітынгах адказваў, што людзі маюць права выказаць свае адносіны да падзей у краіне...

Зразумела, народны дэпутат СССР Георгій Тарнаўскі меў права выказаць свой пункт погляду. Як і народны дэпутат БССР Уладзімір Станкевіч, які прывёў такі факт: пракуратура Віцебскай вобласці яшчэ 19 жніўня прыняла заяву, у якой асудзіла дзейнасць ДКНС, многія народныя дэпутаты змаглі выказаць свае негатыўныя адносіны да загаворшчыкаў, а Пракуратура рэспублікі ў гэты час маўчала! Таму, гаварыў Станкевіч, пытанне аб Генеральным пракурору суверэннай рэспублікі з'яўляецца вельмі важным, тым больш, што пракуратура Беларускай ваеннай акругі сёння не падначалена Пракурору БССР. І большасць дэпутатаў пагадзілася з гэтымі і іншымі довадамі.

А вось пытанне аб прыватнай уласнасці на зямлю, аб дэнансацыі Саюзнага дагавора 1922 года нечарговая сесія разглядаць не пажадала. І найбольшай вастрыні спрэчкі дасягнулі пры абмеркаванні пытання аб роспуску структур КПСС—КПБ на тэрыторыі Беларусі. Довады членаў апазіцыі вядомы. Прывядзём аргументы дэпутатаў-камуністаў, якія таксама выступілі за ўключэнне гэтага пытання ў парадак сесіі. Матывацыя іх была прама адваротная. Так, Іван Каратчэня прапанаваў пытанне сфармуляваць проста: «Аб КПСС—КПБ». Народны дэпутат СССР, першы сакратар Гродзенскага абкама КПБ Уладзімір Сямёнаў даказваў, што прынятая на мінулай сесіі пастанова аб КПСС — КПБ звязала рукі камуністам, яны не могуць ні выйсці з партыі, ні ўступіць у якую другую, бо дзейнасць КПБ прыпынена! І прыпынена, на яго пункт погляду, незаконна.

Такім чынам, на разгляд сесіі большасцю галасоў уключаецца пункт у фармулёўцы Івана Каратчэні.

Калі пішуцца гэтыя радкі, разгляд пытанняў, прапанаваных у парадак сесіі, працягваецца. Безумоўна, многія з іх таксама важныя, патрабуюць неадкладнага вырашэння.

У канцы справаздачы не магу не адзначыць, што на заклік Ніла Сямёнавіча Гілевіча адклікнуліся толькі два дэпутаты. На роднай мове ў сценах парламента загаварылі Леанід Пятровіч Козік і Дзмітрый Пятровіч Булахаў...

У другой палове дня пачаўся разгляд пытання наконт выбараў Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі.

У выбарчы бюлетэнь былі ўнесены чатыры кандыдатуры: Станіслаў Шушкевіч, Вячаслаў Кебіч, Генадзь Карпенка, Уладзімір Заблоцкі. Вечарам адбыліся выбары Старшыні Вярхоўнага Савета БССР, але, на жаль, пад час падпісання нумара ў друк вынікі яшчэ былі невядомыя...

**Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ,**
**аглядальнік «Народнай газеты».**

---

Погляд у мінулае

## ЯКІ ЗНАК ТВОЙ?

— Kto ty jestes?
— Polak mały.
— Jaki znak twój?
— Orzeł biały.

Шмат разоў я заўважаў, што гэты патрыятычны вершык з польскае школьнае чытанкі ужо некалькі дзесяцігоддзяў будзіць нейкі ірацыянальны непакой у душах беларусаў, якія з ім знаёмы. Прычынаю, як я мяркую, можа служыць пачуццё «белай зайздрасці» да нашых братоў-суседзяў, якія на працягу стагоддзяў дзялілі з намі агульны, не заўжды спрыяльны лёс, але ўрэшце здолелі вытрымаць пакуты нацыянальнай паняверкі, захаваць у сваіх душах пачуццё годнасці, вярнуць сваёй забранай бацькаўшчыне гонар і незалежнасць, а зараз, адхінуўшы «жалезную куртыну» (заслону), зрабіць першыя, даволі ўпэўненыя крокі, у накірунку вяртання ва ўлонне еўрапейскай цывілізацыі.

Браткі-беларусы! Досыць з зайздрасцю пазіраць на суседзяў! Надышла часіна пацвердзіць сваё права «людзьмі звацца».

Гістарычныя дасведчанні нашых былых «солагерьников» і «союзников» Польшчы і Летувы яскрава даводзяць, што пошук уласнае тоеснасці можа адбывацца толькі на шляхах цывілізацыі, на грунце адраджэння агульналюдскіх каштоўнасцяў. Бо калі ізноў «мы пойдем своим путем», пачнецца блуканне ў цемрадзі нацыянальнага нігілізму, а значыцца, ў атмасферы пагарды з боку іншых народаў. Нельга выпраўляцца на пошукі ўласнае долі, не ўглядаючыся ў святло далёкае знічкі собскай дзяржаўнасці, цяжка будзе цярабіць сабе шлях праз непралазныя гушчары ўчарашняе ідэалогіі, напоўненыя зданямі Маркса, Ніцшэ, Леніна, Сталіна, Гітлера «и иже с ними». Пойдуць на марна нашыя высілкі, калі мы не выб'емся на гасцінец, адзначаны вехамі собскае гісторыі, асветлены ўласнымі сымболямі.

Зараз, калі для шматпакутнае Беларусі настае хвіліна спадзявання, што «загляне сонца і ў наша ваконца», пытанне, якое вынесена ў загаловак, становіцца як нельга болей актуальным: «Які знак твой?».

Ці зможа зараз на такое пытанне адказаць «сярэднестатыстычны» беларус? Адказаць цалкам свядома, зразумела і проста, як адказвае кожнае польскае дзіце, кожны нармальны чалавек у нармальнай краіне.

Адразу трэба агаварыцца: неадназначныя, мякка кажучы, дасведчанні супольнага існавання ў Рэчы Паспалітай Абойга Народаў дазваляюць нам безварункова адказаць на гэтае пытанне іншымі словамі, чым тыя, што вынесены да эпіграфа.

Пошукі адказу на пытанне аб нацыянальных сымболях беларусаў могуць быць плённымі толькі на парослых быльнёгам забыцця сцежках нашае гісторыі. І не дапамогуць ані нам, ані нашым дзецям у гэтай жмуднай (карпатлівай) працы старонкі сучасных падручнікаў-лямантароў: «Букварей» і «Буквароў». Бо з першага мы даведаемся, што «Вот серп и молот — добрый знак!

Вы, верно, догадались:
Крестьянин и рабочий так
Навеки побратались».

У другім жа да геральдычнай тэматыкі можна аднесці, мусіць, толькі такія радкі:

«Кенгуру, кенгуру,
Спрытна скача ў гару...»

Але гэтая рэмінісцэнцыя, пэўна, датычыцца толькі нацыянальнага сымболю далёкае Аўстраліі.

У кантэксце размовы пра сымболі той эпохі, якая на нашых вачах «сыходзіць з яснай явы», можна зацеміць толькі адно: з гербамі, падобнымі «клейноту» БССР як «близнецы-братья», ужо развіталіся не толькі Грузія і тры краіны Балтыі, але і Угоршчына (Венгрыя), Румынія, Конга, Мазамбік, Лаос, Эфіопія і шэраг іншых краінаў «сацыялістычнай арыентацыі»; няма ўжо ані герба, ані дзяржавы ГДР...

Чаму не ўстоялі гербы, дзе зіхацелі «серп и молот — добрый знак» і яголыя мясцовыя адпаведнікі з дадаткамі ці то цыркуля, ці то аўтамата Калашнікава?.. Калі б грамадзяне краіны, якая абвясціла, што будзе йсці па шляхах цывілізацыі, а не па блытаных пуцявінах ідэалогіі ў пошуках утопіі, нават шукалі магчымасць пакінуць на памяць знак таталітарнай эпохі ў якасці нацыянальна-дзяржаўнага сымболю, гэтага зрабіць ім бы не далося з-за банальнае прычыны: гэтыя «добрыя знакі» не маюць сувязі з традыцыямі нацыі, а як сымболь, які можа аб'ядноўваць усіх грамадзян дзяржавы непрыдатныя, бо з'яўляюцца ідэалагічнымі клеймамі пэўных палітычных партыяў і сэктаў.

У выпадку герба БССР вельмі цяжка ўгледзець штосьці нацыянальна адметнае ў гэтым штучным творы поўным мастацкім безгустоўем і геральдычным невуцтвам. Нельга ж, мусіць, лічыць кветку канюшыны і кветку ільну, якія сарамліва прытуліліся да вяночка-аблямовачкі «серпастого и молоткастого» дастатковаю адзнакаю цэлага народу з тае нагоды, што з аднаго боку «касіў Ясь канюшыну», а з другога —«сеяла Ульяніца лянок». Аб чым сведчаць усе астатнія выявы нашага «герба»? Яны адлюстроўваюць тую эпоху і тую ідэю сусветнай рэвалюцыі, для здзяйснення якой расійскія бальшавікі ў свой час сцяўшы зубы вымушаны былі згадзіцца на ўтварэнне замест любай ім Заходняй Камуны марыянетачнай БССР як плацдарма, з якога нарком Варашылаў, «первый красный офицер» на чале Першай Коннай меў паскакаць на Варшаву, а далей аж на Лондан, бо «от тайги до Британских морей Красная Армия всех сильней». Менавіта аб гэтым нас інфармуе чырвоная зорка ўгары малюнка — знак Чырвонай Арміі, якая мела злучыць у прымусовым шчасці жыхароў аж пяці кантынентаў. (Дзякуй Богу, Антарктыду тады йшчэ «вызваляць» не збіраліся.)

Вось так: «Мы в битвах решаем судьбу поколений».

Таму ўжо не дзіўна, што дэвіз заклікаў пралетарыяў іншых краін яднацца. Зараз, «задним умом», мы разумеем, што цывілізаваная дзяржава не можа сабе дазволіць такога беспардонна-хуліганскага ўмяшання да чужых спраў.

Дарэчы было б заўважыць, што нават тыя чатыры чырвоныя стужкі, на якіх гэны дэвіз выпісаны, могуць шмат чаго расказаць аб нацыянальнай палітыцы бальшавізму на тэрыторыі нашай «суверэннай» рэспублікі: раней заклік да пралетарыяў усіх краін з герба БССР гучаў таксама на польскай і габрэйскай мовах, але пасля Другой сусветнай вайны бальшавікі палічылі, што польскае і габрэйскае пытанні на гэтай тэрыторыі вырашаны канчаткова, і таму часова (да поўнага зліцця) пакінулі надпіс па-беларуску, які дубляваў свой расійскі адпаведнік. А тэрмін «зліцця», здавалася б, ужо не за гарамі, бо кожны з кіраўнікоў-калабарантаў тубыльчай правінцыйнай адміністрацыі чакаў ужо, мусіць, не на загад, а на дазвол метраполіі, каб на наступны дзень адрапартаваць аб паспяховым заканьчэнні кампаніі.

І таму не дзіўна, што серп і молат (чорнага колеру), якія навісаюць над выяваю Зямлі, ужо трэці раз падкрэсліваюць няўмольнасць перамогі бальшавізму, перамогі, трэ' разумець, радаснай бо падсветленай традыцыйным для савецкіх гербаў сонейкам.

Але ўпэўненасці, што па гэтых прыкметах (асабліва недарэчным на гербе БССР выглядае глобус) нехта здужае адрозніць гэты рэспубліканскі абразок ад іншых, у аўтараў твору не было, таму малюнак падпісаны: «БССР».

(Заканчэнне на 2-й стар.).

---

**Мікалай ДЗЕМЯНЦЕЙ:** Падзеі і людзі

## «Жыла б Беларусь...»

*У рабоце шостай нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР Мікалай Іванавіч Дземенцей прымае ўдзел ужо ў якасці звычайнага парламентарыя.*

*І ўсё ж перад пачаткам пленарнага пасяджэння парламента рэспублікі аглядальнік «Народнай газеты» ўзяў інтэрв'ю ў экс-Старшыні Вярхоўнага Савета БССР.*

— Мікалай Іванавіч, як склаўся Ваш лёс пасля адстаўкі з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета БССР?

— Вялікіх змен у маім жыцці не адбылося і не магло адбыцца, паколькі быў і застаюся мой клопат пра беларускі народ, палепшэнне яго дабрабыту. Так што цяперашні дзень мой шчыра заняты. Як і ... у песні «Жыла бы страна родная, и нету других забот». Я б дадаў яшчэ — жыла б Беларусь! А калі будзе жыць Беларусь, то і мне будзе добра.

— Ці ўдзельнічалі Вы ў падрыхтоўцы дакументаў цяперашняй нечарговай сесіі?

— Так, я дапамагаў распрацоўваць дакументы па пытаннях, звязаных з ... у склад утвараемага Вярхоўнага Савета ... суверэнітэту Беларусі. Астатнія пункты прапанаванага парадку дня ...

— Якую параду Вы хацелі б даць свайму спадкаемцу на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета БССР?

— Не прымаць паспешлівых рашэнняў...

Мікола ДЗЯБЕЛА.

Мнение

## Кто живет хорошо, тот будет жить еще лучше?

Какая группа в Верховном Совете БССР будет защищать интересы тех, кто сегодня не имеет жилья, кто ютится в государственных и ведомственных трущобах, коммуналках и общежитиях, кто строит собственное или кооперативное жилье на кровные деньги, заработанные мозолями? Меня очень интересует, есть ли в Верховном Совете депутаты, которые построили за свои деньги дом или кооперативную квартиру? Почему? Потому, что если таких нет, то и защищать эту многочисленную группу населения некому.

По выступлениям в печати руководящих работников мне в основном известна их позиция. Ее суть: проживающие в государственных квартирах в основном их уже заработали, и жилье им следует передавать на безвозмездной основе. А у тех, кто живет, например, один в трехкомнатной квартире, следует выкупить лишнюю площадь.

Странно, но по этому вопросу позиции нынешних функционеров и их политических противников совпадают. В чем дело? Наверное, потому, что те и другие имеют шикарные государственные квартиры и почему бы их не прихватить безвозмездно.

Но как забыть о деревне и небольших городах, где большинство живет в собственных неблагоустроенных домах. Неужели нельзя найти справедливого решения? Кстати, уже сегодня полным ходом идет приватизация жилья на безвозмездной и полубезвозмездной основе, что ведет к незаконной наживе и спекуляции.

**Б. БОГДАНОВИЧ,**
**председатель Копыльского городского Совета народных депутатов.**

Пережитое

## Песня, но не жизнь

**Недавно услышала передачу по радио о трактористе Петре Дьякове. Она еще раз напомнила мне о моем печальном детстве.**

Моего отца раскулачили летом 1931-го. Все хозяйство, нажитое его мозолистыми руками и всей нашей семьей, было разграблено. Отца забрали и послали строить Беломорско-Балтийский канал им. Сталина.

Теперь все уже знают, как строили этот канал заключенные и в каких тяжелых условиях они жили. А сколько их там, ни в чем не повинных, погибло!..

Отец рыл канал, а я училась тогда в начальной школе. В учебнике по чтению было напечатано большое стихотворение «Петр Дьяков». Учительница нам, школьникам, в то время задала на зимние каникулы выучить его. Это было шестьдесят лет назад,—но отрывки я и сейчас помню (конечно, некоторые слова, может, искажены):

**Где-то с переборами тальянки**
**Песня угасала на ветру,**
**В эту ночь не до гулянки**
**Трактористу Дьякову Петру...**
**Прокати нас до речки, до**
**реченьки,**
**Где шумят серебром тополя.**
**Запевайте-ка, девушки, песенки**
**Про коммуну, про наши поля...**

**Замолчала робкая машина.**
**Тракториста с головы до ног**
**Кто-то облил едким керосином,**
**Спичку чиркнул, вспыхнул**
**огонёк...**

Я была удивлена и поняла, какая то была ложь о трактористе, когда несколько лет назад в какой-то газете прочитала статью «Огненный тракторист». Из нее я узнала, что он жив и здоров, всю войну был на фронте, «кулаки» его не жгли и не убивали. После войны он жил в другом месте, вернее, не в той деревне, где его «сожгли».

А теперь по радио о нем рассказали, что никто никакого покушения на него не делал, он жил спокойно, а песня о нем гремела по всей нашей стране.

Вот какая ложь была напечатана в то время и в газетах, и в учебниках. Все эти прожитые годы мы жили во лжи. Наша молодежь должна знать, как честных, трудолюбивых крестьян превратили в «кулаков-мироедов» и ссылали из насиженных мест в далекую Сибирь, тундру, на строительство каналов, и постепенно уничтожили хлеборобов, которые своим трудом кормили всю нашу страну.

**Анна КАПУСТА,**
**пенсионерка, 70 лет.**
г. Березино
Минской области.

# ЯКІ ЗНАК ТВОЙ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).**

Зразумела, што зараз гэткі герб — збуцьвелы анахранізм. Толькі той, хто ніколі не задумваўся над значэннем сымболяў, не бачыць яго агрэсіўнага зместу. Такім наборам «знакаў», дзяржава, якая імкнецца да прыярытэту права, не можа дазволіць сабе карыстацца, бо тут назбіраліся ўсе атрыбуты «партыі новага тыпу», а нацыянальна-дзяржаўная ідэя так і не знайшла адлюстравання.

Дык ці гэта знак твой, беларус?

Свядомыя беларусы шукаюць і знаходзяць уласны адказ: наш знак-сыгнэт, наш нацыянальны сымболь, наш бясцэнны клайнот — гістарычны герб Пагоня: срэбны вершнік з мячом у правай руцэ і тарчай (шчытом) з выяваю шасьцікутнага крыжа —знака Сонца; у левай, які скача на захад па чырвоным (мусіць, ад пралітай праз нашых продкаў крыві) полі. Наш герб — гэта тая Пагоня, якую, як сказаў паэт-вешч Максім Багдановіч, «не разбіць, не спыніць, не стрымаць». Нібыта думаючы аб нас сённяшніх, звяртаецца Багдановіч з запытаннем да рыцараў Пагоні: «Вы за кім у пагоню спяшыце, дзе шляхі вашы йдуць і куды?» І горкім прысмакам застаюцца на вуснах словы Паэта: «Мо яны, Беларусь, панясьліся за тваімі дзяцьмі ўздагон, што забылі цябе, адракліся, прадалі і аддалі ў палон...» Ці знойдзецца гэтым радкам мейсца ў новай сапраўды беларускай школьнай чытанцы?

Так, многія з беларусаў толькі зараз успамінаюць аб тым, што «в лето 1278... Витен нача княжити над Литвою, измысли себе герб и всему княству Литовскому печать: рицер збройный на коне з мечем, еже ныне наричут Погоня».

Чытаючы радкі старадаўніх летапісаў, абавязкова трэба памятаць, што цэнтр старажытнае Літвы месціўся недалёка Наваградка (Наваградка), што пачынальнік угра-фінскае дынастыі князёў Літоўскіх Міндоўг быў запрошаны на княжэнне да Наваградка славянскімі жыхарамі гэтага места, што назва Беларусь з'явілася на мапе (геаграфічнай карце) адносна нядаўна, а дагэтуль праз стагоддзі наш край Літвою зваўся, а сучасныя беларусы—ліцьвінамі. Трэба таксама памятаць, што продкі сучасных літоўцаў (літувісаў) на працягу ўсёй гісторыі (да XIX стагоддзя) зваліся жамойтамі (жмудзінамі) і зямля Жамойцкая мела асобны (аўтанамічны) статус у Літоўскім вялікім княстве і свой уласны герб — Мядзьведзя.

Але чаму князь Віцень «гербу Китавров князей Римских» не зрабіў у 1278 годзе выяву кентаўра гербам Вялікага Княства, як гэта практыкавалася на той час? Справа ў тым, што «рицер збройный на коне з мечем» яшчэ раней фігураваў на пячатках Полацкага княства, а выява шасьцікутнага крыжа на ягонай тарчы прынесена нашымі продкамі-славянамі яшчэ з паганскіх (языцкіх) часоў як Знак Ярылы—Бога Сонца. Такі ж амаль знак зараз аздабляе гербы Угоршчыны (Венгрыі) і Славакіі — земляў, якія лічацца прарадзімаю славянаў-крывічоў. Бо і гістарычныя звесткі і народная памяць захавалі ўспамін аб перасяленні славянаў з берагоў Дуная: у старажытных беларускіх песнях няма згадкі аб якой-небудзь іншай рацэ, як толькі Дунай...

Дзіўныя сплященні гістарычных падзеяў перакручваюць у адзіны вузел вялікае і сьмешнае: на ўсходзе старажытнарускіх земляў княскім знакам быў вершнік з дзідаю-кап'ём у руцэ. Адсюль (ад княскай пячаткі на срэбных манетах) пайшла назва «капейка». На нашых землях знакі аплаты штэмпляваліся выяваю вершніка з мечам-шабляю, а грошы зваліся «шабэлькамі». Яшчэ й зараз можна пачуць на Беларусі, як чалавека, які й паўгроша не варты, клічуць «паўшабэлкам». Гэта так, да слова...

Але ці не можа здарыцца, што ў нашым апатычным чаканні на тое, што «неяк жа ды будзе», не нам залаты дукат незалежнасці блісне выяваю рыцара Пагоні, што нашчадкі ацэняць нас коштам паўграшовіка?

Шукаючы вытокаў нашых геральдычных традыцыяў, трэба таксама ўспомніць, што пасля рэвалюцыі 1917 году на руінах Расійскае імпэрыі ўзнiклі аж тры дзяржавы, якія абвясцілі Пагоню сваім сербам: Летувіская рэспубліка са сталіцаю ў Каўнасе, Сярэдняя Літва пад польскім пратэктаратам са сталіцаю ў Вільні і Беларуская Народная Рэспубліка са сталіцаю ў Менску. Падзел Беларусі паміж РСФСР і Польшчаю ў 1920 годзе пакінуў за БССР толькі дробныя кавалкі яе тэрыторыі, Сярэдняя Літва неўзабаве была далучана да Польшчы і над яе абшарам аж да 1939 году распасцёр свае крылы белы польскі арол. Герб Пагоні застаўся толькі на сцягах, што луналі над Каўнасам.

Гістарычныя падзеі, асабліва апошніх двухсот гадоў змаганьня за вызваленне ад прыгнёту царызму і таталітарызму яшчэ вышэй узнеслі Пагоню на п'едэстал нацыянальнае святыні. Не толькі пад Грунвальдам яна вызначала баёвыя шыхты беларускіх харугваў, выява Збройнага Рыцара лунала над рэгімэнтамі Тадэвуша Касьцюшкі і дружынамі касінераў Кастуся Каліноўскага. Гэтай нацыянальнай святыні аддаюць пашану нашчадкі двух братніх народаў: як беларусы-ліцьвіны, так і літоўцы-летувісы, нашчадкі народаў, якія будуюць гмахі сваёй дзяржаўнасці на падмурку былога Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Здаўна вядома: хто носіць прозвішча бацькі свайго, першы будзе ўпісаны да ягонага тэстаменту. І гэта добра разумеюць нашыя браты-летувісы. Таму герб Летувы—Віціс-Пагоня, а не жамойцкі мядзьведзь, як бы таго магла вымагаць сцісла зразумелая традыцыя і неіснуючая логіка гісторыі.

Нашыя браты-суседзі з Літоўскае рэспублікі Жамойціі і Аукштайціі ўжо даўно афіцыйна аднавілі старажытны герб. А каб ніхто не зблытаў іхняга Віціса з якімсь іншым знакам, у доле тарчы (шчыта) змешчаны дынастычны сыгнэт роду Гедэмінавічаў — Ягелонаў: Калюмны, альбо, інакш кажучы,— Гедэмінавы Слупы.

Дык які ж герб павінна мець наша краіна: Літоўская дзяржава Белай і Чорнай Русі?.. (Не маем мы права адцурацца нашае шматвяковае гісторыі Вялікага Княства).

Адказ адзіны — Пагоню.

А ці маем мы знак, які б адрозніваў Крывіцкую (Беларускую) Пагоню ад Жамойцка-аўкштайцкага Віціса?.. Ёсць такі знак! Але яго трэба адшукаць.

Паслядоўнікі Ч. Дарвіна ў пошуках звяна эвалюцыі, якога бракавала да змацавання ў адзіны ланцуг іх тэорыі, адшукалі з дапамогаю палеантолагаў акамянеласці вымерлага мільёны гадоў таму, але заразвядомага кожнаму школьніку, **ланцэтніка.** Тэорыя набыла закончаную форму.

Чаму б нам, народу, які апынуўся перад безданню нябыцця не спрабаваць адшукаць свае повязі з уласнай жыццядайнай гісторыяй, каб выкарыстаць знойдзеныя знакі гераічнай мінуўшчыны для мэтаў адраджэння нашай занядбанай самасвядомасці?

— Якім чынам?

— Возьмем прыклад з дарвіністаў. Ведаючы, што ў пэўныя гістарычныя перыяды (акрэсы) асобныя геральдычныя знакі набывалі нязвыклую «папулярнасць», прывабнасць і, як бы мовіць, — прэстыжнасць, можна нейкім чынам з'арыентавацца ў накірунку пошуку. Напрыклад, улічваючы нязвыклa высокі аўтарытэт Бізантыцкае (Візантыйскай) імпэрыі, можна чакаць, што нават па ўпадку гэтае дзяржавы яе сыгнэты-сымболі знойдуць новых спадкаемцаў. Так яно й сталася: чорны двухгаловы візантыйскі арол стаўся знакам Свяшчэннай Рымскай імпэрыі Германскай нацыі (пазнейшай Аўстра-Венгрыі), Вялікага княства Маскоўскага (пазнейшай Расійскай імпэрыі), гербам Сербіі і Албаніі. Цікава, што і лінгвістыка, (як Дарвіну — палеанталогія), дапамагае нам у гэтых пошуках: уладцы, якія карысталіся гэтым сыгнэтам, выкарыстоўвалі тытул, запазычаны ад імя Юлія Цэзара: цэсар, кесар, кайзер, цар...

Задамо сабе наступнае пытанне: які б тытул прыбралі сабе нашыя (літоўскія, рускія) князі маючы намер узвысіцца над іншымі? Гісторыя сама дае нам адказ: як толькі вялікія князі набіралі дастаткова моцы, яны каранаваліся на каралеўства. Так было і з Данілам Галіцкім, і з Міндоўгам Навагародскім і з Уладыславам Ягайлам. Такім чынам — **кароль.** Але адкуль узяўся гэты славянскі адпаведнік годнасці ўладцы, які на міжнароднай мове таго часу — лаціне — павінен гучаць як rex (рэкс)?

— Тая ж гісторыя, як, тытулам цара. Слова «кароль» паходзіць ад уласнага імя можнаўладнага сярэдневечнага гаспадара вялікай заходнееўрапейскай імперыі — Карла Вялікага.

— Які герб меў ён і якім гербам карысталіся яго нашчадкі-каралінгі?

Мы ўсе ведаем яго з дзяцінства: гэта Лілея. Тая каралеўская Лілея, пад якой змагаліся мушкецёры, знак якой пакінуў кат на прывабным плечуку Мілэдзі, але... досыць дзяцінства. Ці не нагадвае нам нешта Лілея?

Дзіўная справа... Лілея вельмі падобная да гэрбу дынастыі Рурыкавічаў (Кіеўскага Трызуба). А мо ў гэтым і няма нічога дзіўнага, бо калі «прія власть Рюрик, и роздая мужем своим грады, ...по тем городом суть находници варязи». Нічога дзіўнага, што нарманы-варагі з Заходняе Еўропы прынеслі і прыстыжны для гэтага рэгіёну сымболь — варыянт Лілеі Каралінгаў. Але і Гедэмінавы Слупы в Наваградка нечым падобныя да Трызуба...

Калыскай нашае дзяржаўнасці быў старажытны Полацк. Можа полацкі геральдычны знак менавіта з гэтай серыі сыгнэтаў? А хто б меўся быць уладальнікам такога сыгнэту? Гісторыя падказвае, што трэба шукаць знак дынастыі Рагвалодвічаў, бо як сцвярджае летапіс «в лето 980... Рогъволод пришел из заморья, имяше власть свою в Полотьске».

Дзе шукаць таго знаку? Можа, пачнем с музэя... З Беларускага Дзяржаўнага Музэя. Не з вышэйшых паверхаў, дзе окладзены не адзначаныя вытаньчоным густам прэзэнты тубыльчым кіраўнікам-сэрвілістам, якія спрабавалі закрэсліць усю былую гісторыю нашага народу і наляпіць свой уласны партрэт (безумоўна, пасля партрэта Гаспадара) на першыя старонкі новых «пралетарскіх» падручнікаў, напісаных праз паслужлівых гісторыкаў-абэцэдарскіх.

Шукаць трэба на сціплым партэры. У адной са звычайных габлётаў (вітрынаў) яшчэ некалькі гадоў таму экспанаваўся пярсцёнак-пячатка Усяслава Чарадзея, «Рогволожьего внука, князя Полоцкого (1044—1101). Зараз там застаўся толькі яе васковы адбітак і малюнак-«прорисовка». **Вось такім** сыгнэтам пячатваўся «Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше, а сам в ночь вълком путь прерыскаше», як пісаў аб ім аўтар «Слова о плъку Игореве».

Вось, аказваецца, як выглядае мэта нашага пошуку — «Лілея Рагвалодвічаў», вось, аказваецца, якім візарункам павінна быць адзнакавана нашая, Крэўская Пагоня. Вось ён сціплы ў сваёй амаль геаметрычнай дасканаласці клейнот.

Ён цалкам натуральна ўпісваецца ў адзіны гістарычна абумоўлены шэраг геральдычных знакаў, як неабходнае звяно пераймальнасці часу: Лілея Каралінгаў — Кіеўскі Трызуб Рурыкавічаў — Знак Усяслава-Чарадзея — Гедэмінавы Слупы.

Які знак Твой?

— Пагоня.

Але мо калі-небудзь і Лілея Рагвалодвічаў пад знакам Пагоні расцвіце Папараццю-Кветкай нашага доўгачаканага Адраджэння...

**Віталь КОШАЛЕЎ,**
**лекар-тэрапеўт, дацэнт Менскага медычнага інстытута, старшыня суполкі Таварыства Беларускай Мовы імя Франьцішка Скарыны.**

**АД РЭДАКЦЫІ:**
**Паколькі гаворка ў гэтым артыкуле ідзе пра нацыянальную сімволіку нашай рэспублікі, рэдакцыя палічыла неабходным не ўносіць карэктывы ў стылістыку і правапіс матэрыялу, прапанаванага ёй аўтарам.**

Конфликт

# ЧУЖАЯ СРЕДИ СВОИХ

## Как в Барановичах номенклатурная рать расправилась с человеком

**У меня сложилось такое впечатление, что для высоких начальников барановичского масштаба конфликт, возникший вокруг Нины Михайловны Гринчик, стал чем-то вроде символа. Символа, который работает на возвышение авторитета представителей власти.**

В чем сущность предполагаемой символичности? Об этой женщине, энергичной, образованной, далекой от старости, говорят в Барановичах как о первой официальной безработной. Бывшая секретарь горисполкома добивается возврата в прежний служебный кабинет, а ей категорически отказывают. И те, кто не хочет слушать аргументов Гринчик, уверены, что они — само проявление духа времени, оберегающее законность, справедливость, честь.

Мне в этом конфликте увиделось другое. Трудности времени, основательно царапнувшие интересы касты начальников, которая особенно сильна в провинции, словно фотографический проявитель рисует нам, сколь необязательны законы морали для тех, кто пытался и пытается руководить своим народом.

Судьба Нины Михайловны Гринчик отдана на съедение воле случая, отдана с безразличием, которое граничит с цинизмом. Право так утверждать дает то обстоятельство, что под мельничные жернова жизни брошено благополучие «своего» человека.

Жизнь Гринчик — это, выражаясь высоким штилем, служение комсомолу, партии, Советам и, конечно же, людям. В 1956 году ее, молоденькую учительницу Железницкой восьмилетней школы, уговорили перейти в Барановичский райком комсомола, опрокинули ее собственные сомнения и сопротивление родителей-крестьян. С тех пор служебная лестница выглядит так: Брестский обком ЛКСМБ— инструктор, Барановичский райком ЛКСМБ — первый секретарь, там же райком КПБ — секретарь, Брестский обком КПБ—инструктор, Кобринский горком КПБ — секретарь, Барановичский горком КПБ — зав. отделом, потом секретарь местного горисполкома.

К этому перечню хочу добавить весьма немаловажное обстоятельство: Нина Гринчик к университетскому образованию прибавила диплом с отличием (подчеркиваю, с отличием, изучала советское и государственное строительство, право) академии общественных наук при ЦК КПСС. Кадр (если употребить выражение из партийного жаргона) подкованный, проверенный, опытный.

И вот строки из ее письма в «Народную газету»: «Вирус произвола и бюрократической волокиты поразил органы советской, партийной и судебной власти, как СПИД. Страшно: как мы не защищены от беззакония, особенно мы, женщины. Нас выдвигают на те или иные должности, мы стараемся трудиться, отдавая себя полностью работе, но, когда понадобится место для кого-то, особенно сейчас, когда в Советы бегут в массовом порядке партработники, бегут по нашим головам, как по трупам. Какие тут уставы, какие законы?! «Ты виноват уж тем, что хочется мне кушать. — вот главная заповедь служителей беззакония».

Мне подумалось, возможно, Нину Михайловну отторгает своя же номенклатурная братия за какие-то прегрешения, упущения, их ведь нетрудно найти. Это каста любит отыгрываться, демонстрировать свою принципиальность на слабом. К сожалению, главной фигуры во властной структуре Барановичей и в конфликте, председателя горсовета Николая Лобко во время командировки я не застал — он только ушел в 30-дневный депутатский отпуск.

Ситуацию помогли прояснить второй секретарь Барановичского горкома КПБ (тогда еще не приостановленной) Валерий Захарченко и управляющий делами горисполкома Владимир Пустынин.

Версия о возможно запятнанной репутации отпала сразу. Партийный секретарь недвусмысленно заявил: «Претензий к Гринчик не было». После некоторой паузы добавил: «Характер у нее, правда, женский, взрывной...» Но, думается, что женщины с мужским характером более опасны, чем женщины с женским... На вопрос, почему же в таком случае Гринчик лишилась должности, Валерий Захарченко ответил так, что Лобко сам и для себя подбирал кадры, думал, с кем ему будет лучше работать, это его законное право... Что касается судьбы Гринчик,так о ней заботились: помнится, во время сессии, рассказывал Захарченко, вставала депутат-директор школы, приглашала Нину Михайловну к себе в заместители с перспективой на директорское кресло...

Забота, что и говорить, конкретная, но почему ее проявляла депутат, а не руководители Совета? Этот вопрос теперь не повиснет в воздухе. За время конфликта (начался он в апреле 1990 года) у противоборствующих сторон накопились пухлые папки — и над сутью возвышается могильный холмик из тщательно продуманных бумаг.

Высказал Валерий Захарченко и свое понимание несгибаемой позиции Гринчик: «У нее накопилось много горечи, обид, приходится уходить с очень высокого уровня на более низкую работу».

Этот вывод лежит на поверхности, и его поднимают постоянно, потому что копаться глубоко и по-настоящему не хочется. Да, горечь и обида у Нины Гринчик есть, что по-человечески понятно. Но они не единственная причина, которая вдохновляет ее на активное сопротивление.

Я не хочу подробно вдаваться в юридические тонкости происшедшего (насколько мне известно, жалобой Н. Гринчик в настоящее время занимаются работники республиканской прокуратуры) и ставлю своей целью оттенить аморальность выдворения человека с работы.

Первое, что хотелось бы подчеркнуть: по существующему законодательству Гринчик должны были представить имеющиеся на тот момент в исполкоме вакансии, а если бы их не было, то вернуть обратно в горком КПБ. Ничего этого предложено не было.

Как известно, должность секретаря исполкома преобразована в управляющего делами (фактически с теми же функциональными обязанностями). Но председатель горисполкома Николай Лобко вначале публично заверял депутатов, что на это место желателен инженер по коммуникациям, затем — финансист... В итоге его занял работник горкома КПБ, ихтиолог по специальности Владимир Пустынин. В этой связи интересна аргументация руководителей. Гринчик — педагог-географ, грех ей отказываться от школы... Довод демагогический, по такой схеме самое подходящее место для Пустынина — рыбхоз...

В партийно-руководящей среде не принято иметь свое мнение, свое желание, своемыслие расценивалось, как пугачевский бунт, и смелых карали словесными батогами... Нина Гринчик пыталась доказывать, что ей по силам должность управляющего делами, что у нее уже есть опыт, желание и умение. Но руководители в узком кругу проиграли варианты перестановок, и бывшая секретарь исполкома не вписывалась в их планы. Это странная ситуация: по сути дела безукоризненный работник отвергается? Да, ей предлагалась должность заведующей горсобесом. Нина Михайловна отказалась, испугавшись малознакомого профиля будущей деятельности, затем, испугавшись безысходности, согласилась, но ее желание строгие большевики отвергли. В знак наказания за непослушание.

В рамках статьи невозможно даже перечислить все события, связанные с защитой собственного достоинства Н. Гринчик. Она побывала во многих кабинетах Верховного Совета БССР, ЦК КПБ и так далее. Ее везде с сочувствием выслушивали...

...руководитель печально заметил, что грех раскидываться такими кадрами и он навел бы порядок, будь министром внутренних дел, а Гринчик — офицером, тогда за пять минут — приказ и справедливость торжествует. А как же тогда быть, если событие происходит вне стен казармы? Говорят, что Николай Лобко на все увещевания (и даже давление, как выразился Владимир Пустынин) твердо советует, так заберите Гринчик к себе в Минск, раз она такая хорошая. А в команду Лобко она не вписывается—и все тут, несмотря на высокую квалификацию.

Мы шли с Ниной Михайловной по центру Барановичей. На каждом шагу с ней здоровались, как со старой и доброй знакомой. Она настаивала побывать в ее округе, поговорить с ее избирателями, но я уже имел возможность познакомиться с письмами граждан, адресованными депутату Гринчик, и понял, что активность — ее глубоко укоренившееся человеческое качество. Потому и стучит сейчас во все двери Нина Михайловна, чтобы переубедить с чьей-то помощью местных барановичских руководителей.

Но там выстроен железобетонный глухой редут. Помните, как в известной песне: «Отряд не заметил потери бойца...» Бессердечный отряд, не правда ли? Естественно, я имею в виду отряд руководителей. А депутаты что же? На них тоже, видимо, подействовал стереотип восприятия: раз отвергают, значит, есть за что. К тому же, аккуратно и своевременно делались намеки о неладах в семье. Хотя в данном случае обвинять некого и не за что. Не удалась семейная жизнь, но это личная беда Нины Михайловны, не имеющая к работе никакого отношения.

Эта история — словно горький плод от корявого дерева. Вырастет ли на нем сладкое яблоко справедливости? Хотелось бы...

**Николай ГАЛКО,**
**обозреватель «Народной газеты»**

О том, что волнует

## Конюшня, которая не попадает в свет «юпитеров»

Я живу в знаменитом на всю республику колхозе имени Сильницкого. Все у нас привыкли к бесконечным иностранным делегациям, к съемкам кино и телевидения. Привык и председатель, Герой Социалистического Труда Евгений Иванович Кимстач. Гости обычно из конторы идут в музей трудовой славы колхоза, где с увлечением рассказывает о наших героях и наших буднях Антонина Антоновна Кимстач, жена председателя.

Вот только в лучи этой славы никак не попадет старая конюшня, оборудованная под барак. В ней живут забытые богом пенсионеры и инвалиды, которые трудились некогда на благо колхоза и которые, все ему отдав, остались ни с чем. На торжества, а последнее было совсем недавно, — 60-летие председателя, — их не приглашают. И поэтому, прильнув к окнам, они взирают на чужое благополучие. По щекам Елизаветы Николаевны Коршун текут слезы. У нее 52 года трудового стажа, но в гремящей меди праздничного оркестра ни разу не произносили ее имени. Конечно, жизнь полна контрастов, но неужто не видят в колхозе этих слёз заброшенного одиночества, тем более, что окна конюшни выходят на музей трудовой славы, который часто находится в свете «юпитеров».

**Маргарита ШАРОЙКО.**
д. Близница,
Полоцкий район.

## За что им такие пособия?

Я как пенсионер и участник войны, получаю такую пенсию, что едва хватает на жизнь. В то же время пенсионеры- партаппаратчики почему-то имеют персональные пенсии и, более того, ежегодно получают тринадцатую пенсию—как рабочие на заводе. За что же им такие пособия? За то, что развалили страну? Наделенные властью, больше думали о личном обогащении, чем о всем народе.

Переворот высветил подлинное лицо этих «деятелей». Пришло время отменить всякие льготы и привилегии. Пусть Верховный Совет доведет начатое дело до конца.

**Дмитрий САМОЙЛЕНКО.**
г. Борисов.

## Будынак гаркама партыі—дзецям

Што сабой уяўляе Слонімскі гарадскі Дом піянераў і школьнікаў нават цяжка апісаць: тры пакоі, якія ўмяшчаюць па 20 чалавек і тры пакоі — па 5 квадратных метраў. А ў ім існуе зараз 87 гурткоў, у якіх займаюцца больш за 1300 дзяцей. Будынак стары, дажджы затапляюць асобныя пакоі, пячное ацяпленне, згніўшы даўно вадаправод і г. д. Адным словам — поўнасцю адсутнічаюць нармальныя чалавечыя ўмовы для работы з дзецьмі.

Затое ў цэнтры горада красуецца пусты будынак з мармуровай аддзелкай былога гаркама партыі. Ці не пара яго перадаць дзецям горада Слоніма, як гэта, напрыклад, зрабілі ў Ваўкавыску? Відаць, пара!

**Сяргей ЧЫГРЫН.**

Факт

## Кому на БелаРУСИ жить хорошо?

**При нынешнем галопирующем росте цен вопрос «Сколько зарабатываешь!» звучит далеко не празлно.**

На сей счет Госкомстат республики беспристрастно отмечает, что пальму первенства ... требление на одного работающего, прочно удерживает кооператор — 455,5 рубля.

Деньги отнюдь не «сумасшедшие», учитывая, что рабочий и служащий имеет лишь на 93 рубля меньше (362,4 рубля). Почти на 80 рублей (282,7 рубля) отстает от рабо-...

В ДВУХ СЛОВАХ
ТАСС • «ИНФО-НОВА» «НАРОДНАЯ ГАЗЕТА»

### ИНФОРМАЦИОННАЯ БЛОКАДА

В ответ на «информационную войну советской прессы» власти Грузии объявили информационную блокаду: в республике прекращено печатание и распространение газет «враждебного государства».

### ЗАРОЖДАЕТСЯ НЕОБОЛЬШЕВИЗМ

В Кузбассе зародился необольшевизм, заявил в своей публикации в областной газете «Кузбасс» профессор Кемеровского университета Сергей Рябых. По его мнению, последняя двухмесячная политическая забастовка шахтеров — убедительное свидетельство отхода рабочих (бывших забастовочных) комитетов от демократических принципов. Тогда требовали отставки Президента страны, правительства и Верховного Совета. В этом кемеровский профессор видит совпадение современных и большевистских лозунгов 1917 года.

### ОТОЗВАН ГЕНЕРАЛ

Из Литвы отозван генерал КГБ СССР Федосеев, до сих пор руководивший ликвидацией подразделений КГБ СССР в республике. Об этом заявило пресс-бюро литовского правительства.

